У 3-м кургане знойдзена трупаспаленне і 6 упушчаных у насып позніх касцякоў, з якіх адзін дзіцячы, астатнія дарослыя. Да нашага часу захавалася 19 кургаоў.

Курган 4 дыяметрам 6 м, вышынёй 1,05 м. На мацерыку знойдзены 12 кавалкаў кругавой керамікі. Мацярык цвёрды. Пахаванне не выяўлена.

Курган 5 дыяметрам 8 м, вышынёй 1,6 м. На гарызонце ляжаў касцяк, арыентаваны на З. Нябожчык (1,7 м) пакладзены на спіну. У вобласці таза знойдзена бронзавая спражка з адбіткам тканіны, моцна спрацаваны сланцавы брусок, жалезны нож з рэшткамі драўлянай ручкі, бронзавае паясное кальцо і калачападобнае крэсіва. Сякера з адбіткам тканіны ляжала пад правым каленам. Каля ног і чэрапа — 4 жалезныя каваныя цвікі даўжынёй 11—12 см. Пахаванне датуецца XI ст.

Курган 6 дыяметрам 10 м, вышынёй 1,6 м. На глыбіні 1,3 м, на падсыпцы 0,3 м касцяк (1,55 м). Нябожчык ляжаў на спіне галавой на Пн, кісці рук на жываце. У насыпе знойдзена 5 кавалкаў ляпной керамікі трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э. Відаць, курган узводзіўся на месцы паселішча, культурны пласт якога дакладна не прасочваўся. Да пахавання адносяцца невялікі нож, бронзавае кальцо дыяметрам 1 см, сагнутае з дроту, сердалікавая 8-гранная пацерка, 4 шкляныя залачоныя пацеркі дыяметрам 10 мм, каменная цыліндрычная пацерка такіх жа памераў, 2 жалезныя каваныя цвікі. Дата пахавання XI ст.

Курган 7 дыяметрам 3 м, вышынёй 0,7 м. Выглядае зусім малым у могільніку. Каля краю насыпу ляжала галёнка. Напэўна, косць выпадковая і курган адносіцца да ліку парожніх.

*Запружаны.* У в. Запружаны, каля балоцістай нізіны, курганны могільнік з 6 круглых і 1 падоўжанага кургаоў. Вышыня круглых 2,5—4 м, дыяметр 10—15 м. Падоўжаны шырынёй 12 м, вышынёй 2,5 м, даўжынёй 30 м. Раскопкі не праводзіліся.

*Іванск.* Ля былой в. Палітаддзел (злілася з в. Іванск), за 1,5 км на ПдУ ад вёскі, ва ўрочышчы Барок, злева ад дарогі ў в. Трылесіна, у невялікім ляску на левым беразе р. Ула курганны могільнік з 9 кургаоў вышынёй 0,6—2 м, дыяметрам 6—8 м. Самы вялікі курган дыяметрам 15 м. Паміж насыпаў ёсць 1 жальнік вышынёй 0,6 м, дыяметрам 10 м (пераходнае пахаванне — ад кургаоў да сучасных магіл). З Пн абкладзены пяццю вялікімі камянямі. З іншых бакоў захаваліся сляды камянёў. Мясцовая назва курганнага могільніка Валатоўкі. Раскопкі не праводзіліся.

*Лукомль.* Ля в. Лукомль за 0,9 км ад гарадзішча ва ўрочышчы Праклятае поле, каля дарогі на в. Чарэя, Е. Р. Раманаў знайшоў і апісаў курганную групу, дзе 6 кургаоў размяшчаліся ў 2 рады. Е. Р. Раманаў раскапаў 1 курган у верхнім радзе, 2-гі — з краю. Знойдзены трупапалажэнні з вялікай колькасцю рэчаў, сярод якіх сякера-чакан, наканечнікі дзідаў, берасцянае вядро з жалезнымі абручамі. У 1966—1967 гг. Г. В. Штыхаў даследаваў гэты курганны могільнік, які можна разглядаць як рэшткі некропаля старажытнага Лукомля. На грэбні ўзвышша даследаваны 3 курганы. Дарэчы, у 1970 г. курганы былі адноўлены.

Курган 2 дыяметрам 10 м, вышынёй 1,2 м. Насып са жвіру. У насыпе ўпускное трупапалажэнне (180 см). На глыбіні 1,2 м ад вяршыні знойдзены касцяк мужчыны ўзростам 25 год. Вакол касцяка 11 каваных цвікоў. Каля правага пляча жалезны наканечнік дзіды, каля правага калена — невялікая жалезная баявая сякера. Яе ручка спарахнела, аднак у правушыне захавалася частка, дзе быў жалезны кручок для падвешвання сякеры, відаць, да пояса. Паміж каленямі знойдзена бронзавая падкова-падобная фібула, на ўзроўні таза з абодвух бакоў па аднаму бронзаваму кальцу, арнаментаванаму кружкамі. Каля кісці левай рукі — невялікі жалезны нож, ад якога акрамя ляза захава-